**Тэматычны занятак па адукацыйнай галіне**
**“Мастацкая літаратура”**
(ад 4 да 6г.)
**Тэма**: Пераказ апавядання У. Юрэвіча “Бярозчыны валенкі”

**Задачы:** фарміраваць уменне перадаваць апавяданне па ўзоры, актывізавацьсловы, якія азначаюць якасці снегу, сняжынак (4-6г.); вучыць правільна дапасоўваць прыметнікі да назоўнікаў у залежнасці ад роду, ліку; удасканальваць моўнае дыханне; замацоўваць вымаўленне гука [ж]. практыкаваць ва ўменні адказваць на пытанні па зместу тэкста(4-6г.)
Развіваць увагу, памяць, уяўленне, мысленне, маўленне. Выхоўваць цікавасць да беларускай мастацкай літаратуры, жаданне выказваць свае думкі звязна, складна, коратка.
**Ход занятку**
1.Педагог чытае загадку Н. Гілевіча
Яно для ўсіх нас –
Добры друг,
Хоць дзіваком завецца,
Што адзяе вясной кажух,
А ўвосень раздзяецца. (дрэва)
П.: Назавіце вядомыя вам дрэвы. Калі саджаюць дрэвы, якой парой? А як трэба даглядаць маладзенькія дрэўцы ўзімку, каб яны не змерзлі? Што вы апранаеце зімой? А як жа апрануць дрэўца?
2. Педагог чытае апавяданне У.Юрэвіча “Бярозчыны валенкі”.
П. (праводзіць кароткую гутарку па пытаннях): Дзе ўзяла Святланка бярозку? Што яна з ей зрабіла? Як Святланка даглядала бярозку? Што трывожыла дзяўчынку, калі прыйшла зіма? Як Святлана хацела ўкутаць бярозку? Што адказаў ей тата? Як жа тата з дачкой апранулі бярозку? Пакажыце, як кружацца сняжынкі ў паветры. Кожнач сняжынка нібыта выконвае свій танец. Патанцуйце, як сняжынкі.
3. П.: Паслухайце яшчэ раз урывак з апавядання (чытае абзац “Неузабаве бярозка і сапраўды …”). Паўтарыце, якімі слова міраскавае аўтар пра тое, як падае снег. Падбярыце словы пра снег, сняжынкі.
Пытанні-загадкі: Халодны, суровы – гэта мароз ці зіма? Белы, пушысты, бліскучы – гэта снег ці сняжынка? Белыя, маленькія, серабрыстыя – гэта сняжынка ці сняжынкі?
Практыкаванне для развіцця моўнага дыхання “Здзьмухванне сняжынак з далоні”.
4. Педагог дае ўзор пераказу. Па яго ўзоры апавяданне пераказваюць дзеці.

**Тэматычны занятак па адукацыйнай галіне**
**“Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін”**

**Тэма:** “Абутак”

**Задачы:** 4-6г: фарміраваць у дзяцей уменне адказваць на пытанні ; развіваць уменні дзяей суправаджаць маўленнем свае дзеянні; замацоўваць і актывізаваць у слоўніку дзяцей назвы прадметаў абутку, абагульняючага слова абутак, дзеяслоў абуваць; звярнуць увагу на асаблівасці ўтварэння некаторых склонавых форм назоўнікаў (дапамагчы Алесі).
2-4г.: працягваць развіваць уменне выхаванцаў адказваць на пытанні, з дапамогай выхавальніка дашкольнай адукацыі; і актывізаваць у слоўніку дзяцей назвы прадметаў абутку.
Развіваць актыўнае маўленне дзяцей, слоўную творчаць.
Выхоўваць каштоўныя адносіны да багацця беларускай мовы, цікавасць да пазнання прадметаў рукатворнага свету.

**Ход занятку**

*Янка і Арынка.* Добры дзень, дзеці! Учора мы хадзілі ў магазін дзіцячага абутку. Давайце паглядзім разам, які абутак прадаецца ў магазіне. Якую назву дадзім гэтаму магазіну.
Выхавальнік прапануе адкрыць вучэбны наглядны дапаможнік і арганізуе дзейнасць на старонцы “Абутак”.
*Янка* . Цяпер разам раскажам чыстагаворку.
Выхавальнік паказвае па адным прадмеце абутку, пачынае чытаць радкі чыстагаворкі, а дзеці іх заканчваюць:
Оты-оты-оты – зімовыя боты,
Ожкі-ожкі-ожкі – купілі басаножкі,
Ікі-ікі-ікі – Янкавы чаравікі,
Уфлі-уфлі-уфлі – Арынчыны туфлі,
Оўкі-оўкі-оўкі – прыгожыя красоўкі,
Еды-еды-еды – спартыўныя кеды,
Оты-оты-оты – гумавыя боты,
Алі-алі-алі – летнія сандалі.
*Арынка.* Як усе гэтыя рэчы назваць адным словам? (Абутак.) Скажыце, які абутак у магазіне вы выбралі б для Янкі.
*Янка*. Які абутак вы выбралі б для Арынкі?
*Янка*. Давайце пагуляем. Я буду вам кідаць мяч і называць абутак і адзенне, а вы будзеце яго кідаць мне і называць, каму падыходзіць абутак – Арынцы або Янку.
*Янка*. Маленькая лялька Алеся апранаецца пасля сну, давайце дапаможам ёй. Якое адзенне трэба Алесі? (Дзеці з дапамогай выхавальніка знаходзяць на малюнку і называюць прадметы адзення і абутку.)
Давайце вызначым, што будзе апранаць ляльцы кожны з вас. (Дзеці па адным расказваюць, як адзяваюць ляльку: “Я надзяваю на ножкі Алесі белыя шкарпэткі” і да т.п.).

*Арынка.* Знайдзіце на малюнку абутак, пра які расказваецца ў вершы Івана Карпенчанкі “Боты”:

--Мне купілі ў краме боты, –<br>
Выхваляўся доўга Ясь, --<br>
З панядзелка да суботы<br>
Я мяшу ваду і гразь.

*Янка*. Паглядзіце на малюнак. Назавіце абутак і скажыце, для якой пары года гэты абутак.

*Выхавальнік.* Цяпер вы шмат ведаеце пра абутак. Лялькі таксама шмат цікавага даваедаліся пра абутак.